Т.А. Казімірская (Беларусь, Магілёў)

ВЫРАЖЭННЕ ІМПЛІЦЫТУ З ДАПАМОГАЙ ЛАГІЧНАГА НАЦІСКУ (на матэрыяле п'ес А.Макаёнка)

Як вядома, неад'емнай часткай мастацкага твора з'яўляецца падтэкст – "не выражаны словамі ўнутраны сэнс выказвання, які падразумяваецца па "адсутных", "апушчаных" членах сказа ці намёках". [1, 109]

Менавіта наяўнасць падтэксту, імпліцыту, адрозніває мастацкі тэкст ад іншых (напр., навуковага).

Падтэкст, або імпліцыт, можа быць выражаны з дапамогай пераноснага значэння слова, ужывання агульных назоўнікаў у адзінкавым сэнсе, займенніка, пытання, няпоўных сказаў, а таксама лагічнага націску.

Лагічны націск – гэта інтанацыйнае выдзяленне найбольш важнага ў сэнсавых адносінах слова, часта словазлучэння, фразы, цэлага сказа з мэтай сканцэнтраваць на ім увагу [4, 73] – прымяняецца як сродак выражэння імпліцытных думак, а значыць і падтэксту.

З дапамогай лагічнага націску падкрэсліваецца асаблівая важнасць таго ці іншага кампанента моўнай адзінкі ў параўнанні з сэнсам іншых кампанентаў на аснове супрацьпастаўлення іх. Канкрэтная імпліцытная думка выказвання залежыць ад семантыкі пэўнай лексемы, што падпадае пад сэнсава-інтанацыйнае выдзяленне. У сувязі з гэтым прааналізуем некалькі прыкладаў выражэння імпліцыту з дапамогай лагічнага націску ў творах А.Макаёнка.

Сэнсава-інтанацыйнае выдзяленне асабовага займенніка "я" (імпліцытна – Святлана) супрацьпастаўляецца ўласнаму назоўніку "Васіль" і абазначае, што *толькі Святлана* вінаватая, а не Васіль.

ВАСІЛЬ. ...Што гэта такое?

СВЯТЛАНА. Дзе?

ВАСІЛЬ. Во дзе! (Размаўляе з дзяўчынай рэзка, нават груба.) Чорт ведае што! Абракадабра! Бязглуздзіца! Навошта ты пераставіла слова? А?..

НАСТАЎНІЦА. Васіль! Як ты размаўляеш? Перад табой дзяўчына!..

СВЯТЛАНА (пакорліва). Лідзія Сямёнаўна, гэта *я* вінавата. Я зараз папраўлю. [3, 29]

З папярэдняга кантэксту вядома, што настаўніца хваліла свайго сына Васіля і лаяла Святлану, а старшыня Каравай – наадварот. З дапамогай лагічнага націску ў выказванні глыбей выяўляюцца характары не толькі герояў – удзельнікаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

палілога, але і ўскосна, імпліцытна падкрэсліваецца, што старшыня Каравай добра разбіраецца ў людзях.

Калі дзед Цыбулька гаворыць: "Сто – оп! Ваня, стоп! *Маё* дзела галоўнае!" [3, 30], то гэта абазначае, што іменна яго справа важнейшая за справу Івана. Паступова з кантэксту зразумела, чаму Дзед Цыбулька так лічыць.

Калі Вера паведамляе: "Я *назаўсёды* сюды!" [2, 41], то гэта імпліцытна (з дапамогай лагічнага націску і на аснове супрацьпастаўлення) абазначае, што дзяўчына прыехала ў калгас не на кароткі тэрмін, пэўны час, а на ўсё жыццё.

Фраза "...*яго* галаву, канечне!.." імпліцытна (з дапамогай лагічнага націску і на аснове супрацьпастаўлення) абазначае, што яго (Скаромнага. – Т.К.) галаву гатовы пакласці дзед Цыбулька, а не сваю ці чыю-небудзь іншую.

СКАРОМНЫ. Во гэты дзед – народ? Смеху варты ваш народ. Падхалім ты, дзед!

ДЗЕД ЦЫБУЛЬКА (уз'ерапеніўся). Які я табе дзед? Унук мне знайшоўся! Шэры воўк табе дзед, а дзікая каза – бабка! Ды я загадаў такіх унукаў болей двух месяцаў не насіць! Я табе народны кантроль, а не дзед! А ты ... (Паказаў, што ён сапля). Во хто ты!

КАРАВАЙ. Не грубіянь, Цыбулька! А то абстрыгуць на дзесяць сутак.

ДЗЕД ЦЫБУЛЬКА. Мяне? Калі ласка! (Здымае шапку і паказвае сваю лысую галаву.) За народную капейку я гатоў не толькі валасы палажыць, але і галаву ... *яго* галаву, канечне!.. [3, 22-23]

З дапамогай лагічнага націску і на аснове супрацьпастаўлення лексем, словазлучэнняў, сказаў А.Макаёнак імпліцытна выражае падтэкст наступнага выказвання: бібліятэкар Вера склала спіс літаратуры, якую хацела б мець у калгаснай бібліятэцы, найбольш вядомыя і цікавыя творы, навінкі сучаснай літаратуры. Але асобныя прадстаўнікі ўлады лічаць для сябе магчымым вызначаць, якія кнігі можа чытаць і разумець народ, а якія не можа.

ЛОМЦЕЎ. ...*А Вазнясенскага*, вы думаеце, *тут зразумеюць*?

ВЕРА. Зразумеюць.

ЛОМЦЕЎ. Калі нават я... Іншы раз усёй сям'ёй галовы ламаем.

ВЕРА. А ён піша *для дагадлівых*.

КРАНДЗЯЛЁЎ. *Нам* такая літаратура не трэба.

ВЕРА (пакрыўдзілася). Вам? *Вам* – так! *Вам* ніякая літаратура не трэба. *Вам* давай паўлітэркі і даміно! А вот *вы* для літаратуры вельмі патрэбны. Як прататып.

КРАНДЗЯЛЁЎ. Но – но! Толькі без тыпаў!

ВЕРА (папраўляецца). Ну, як правобраз. [3, 44]

З дапамогай лагічнага націску на аснове супрацьпастаўлення выдзеленых лексем, фраз магчыма эксплiцыраваць наступны падтэкст выказвання: крычаць трэба не на жонку з дачкой ("на нас"), а на Каліберава і Моцкіна і "ім" выказваць усё.

НАТАША (да Гарошкі – Т.К.). Што ты *на нас* крычыш? Ты ім так і скажы, а не хавайся. [2, 98]

Электронная библиотека МГУ имени А.А. Кулешова

Лагічны націск і сэнсавае супрацьпастаўленне выдзеленых лексем і фраз ствараюць імпліцыт наступнага дыялога.

М О Ц К І Н . ... Калі хочаш, *заўтра* ты будзеш самым перадавым у раёне.

Г А Р О Ш К А. *Заўтра*? Такіх цудаў не бывае.

М О Ц К І Н . Не бывае? Яшчэ як бывае. Калі хочаш, *сёння* дырэктар спіртзавода выпіша табе квітанцыю на збожжа. Адразу *на пяцьдзесят тон.* Хочаш?

Г А Р О Ш К А . А дзе я вазьму *сёння пяцьдзесят тон?*

М О Ц К І Н . Дзе ты возьмеш? У чарнілцы. Спіртзаводу ты напішаш гарантыйную распіску на хлеб, а мне аддасі квітанцыю. *За пяць мінут* ты станеш *перадавіком*... [3, 104 – 105]

Вынікам выкарыстання А.Макаёнкам лагічнага націску як сродку стварэння імпліцыту з'яўляюцца вобразы герояў: махінатара Моцкіна і сумленнага чалавека Гарошкі.

Некалькі варыянтаў імпліцытнай думкі, выражанай з дапамогай лагічнага націску, можна защважыць у наступным дыялогу:

Г А Р О Ш К А . Канец мне, таварыш Моцкін. Прапаў я... Пракурор дазнаўся. У бухгалтэрыі капаецца. Усё! Канец...

М О Ц К І Н . Чаго ты баішся *цяпер*? Ён жа твой зяць...[2, 134]

Такім чынам, Моцкін лічыць, што менавіта цяпер Гарошку няма чаго баяцца, бо: а) калі ўсё зроблена (супрацьпаст. – калі збіраліся рабіць); б) калі пракурор раёна стаў зяцем (супрацьпаст. – калі пракурор быў толькі афіцыйнай асобай.

Для стварэння імпліцыту ў чарговай рэпліцы А.Макаёнак таксама выкарыстоўвае лагічны націск і супрацьпастаўляе займеннікі "мы" – "вы", якія самі па сабе імпліцыт не абазначаюць: "гандляр"—"пакупнік".

К А Р А В А Й (да Скаромнага). ...Значыць, калі *мы* не ў тэрмін вывезем, то плацім штраф. А з *вас* ні за што ніякага спросу? [3, 22]

Значыць, старшыня калгаса Каравай і раённы нарыхтоўшчык Скаромны падпісалі дамову, па якой уся адказнасць кладзецца толькі на старшыню, а прыбыткі – толькі Скаромнаму.

З дапамогай лагічнага націску і на аснове супрацьпастаўлення семантыкі розных адзінак мовы А.Макаёнак у камедыі "Лявоніха на арбіце" імпліцытна супастаўляе "грамадскае" і "ўласніцкае", паступова ствараючы вобразы герояў. Напрыклад:

М І Х А Л (да Лявона). Увесь тут на далоні: для *грамадскай гаспадаркі мінімум.* А жывот забаліць – шукаеш *дзяржаўную* бальніцу? Грахі свае абмываеш у *камунальнай* лазні? А? А прыйдзе час, запатрабуеш пенсію за кошт *грамадскай* гаспадаркі ды яшчэ за горла возьмеш, каб *максімальную*! [2, 253]

У рэпліках свайго героя лагічныя націскі расставіў сам аўтар камедыі "Каб людзі не журыліся" А.Макаёнак.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

К А В А Л Ь Ч У К (да Цярэшкі. – Т.К.). ... А вінаваты ты сам! У *тваім* жа калгасе непаладкі, на *сваёй* жа спіне адчуваеш іх. А што ты зрабіў, каб іх не было? Ты ж гаспадар! Гэта ж *тваё тут усё*! [2, 152].

А.Макаёнак прыцягвае ўвагу чытача да асаблівага сэнсу, падтэксту выдзеленых слоў. На гэтай падставе чытач экспліцыруе наступнае: калі *"ў тваім* жа калгасе", то гэта абазначае, што іменна ў тваім, а не ў якім – небудзь іншым калгасе; калі "на *сваёй* жа спіне", то гэта абазначае, што адчуваеш на сваёй спіне, а не на чужой. Асобнае значэнне драматург надае апошняму сказу, які цалкам выдзяляецца лагічным націскам: калі "*тваё тут усё*", то гэта абазначае, што гэта тваё, а не чужое, чыё–небудзь; тут, у вёсцы, а не дзе-небудзь у другім месцы; усё, а не частка. У гэтых радках заключаецца асноўная думка твора, таму А.Макаёнак графічнымі сродкамі прыцягвае да іх увагу чытача. Драматург лічыць, што селянін, калгаснік павінен быць гаспадаром на сваёй зямлі.

Прааналізаваныя прыклады сведчаць, што функцыя лагічнага націску ў выражэнні імпліцыту аналагічная функцыі выдзяляльна–абмежавальнай часціцы "толькі" (выключна, адзіна, нічога, акрамя гэтага – паводле ТСБМ). Выкарыстанне лагічнага націску, як і выдзяляльна– абмежавальнай часціцы "толькі", дапамагае пазбегнуць няпэўнасці, магчымай двухсэнсавасці пры экспліцыраванні імпліцытнага.

Літаратура

1. Лазарук М.А., Ленсу А.Я. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў. – Мн., 1983.
2. Макаёнак А. Зб. тв. у 5 – ці тамах. –Мн., 1987 – 1990. Т. 1.
3. – ~ -- ~-- Т. 2 .
4. Сцяцко П.У. і інш. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў. – Мн., 1990.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова